КЛОПАТ — РЭАЛЬНЫ

КЛЮЧЫ АД НОВАЙ КВАТЭРЫ

Карэспандэнт «МС» высвятляла, што спрыяе росту колькасці шматдзетных сем'яў у Слаўгарадскім раёне

Ганна Курцава са Слаўгарада стала шматдзетнай мамай зусім нечакана. У сям'і рыхтаваліся да другога дзіцяці, але раптоўна высветлілася, што будзе двойня. Гэтая навіна не засмуціла маладую жанчыну, наадварот, яна нават узрадавалася. І было з чаго. Перамены да лепшага пачаліся яшчэ да з'яўлення Арцёма і Арсенія на божы свет.

— Я родам са Слаўгарадскага раёна. Мы з мужам і дачкой раней здымалі кватэру і, як усе маладыя сем'і, марылі пра ўласнае жыллё. Але былі пэўныя праблемы з пастаноўкай на чаргу, — расказвае Ганна. — Пасля таго як стала вядома, што я чакаю двойню, усё адразу ж упарадкавалася. Нас не толькі паставілі на ўлік, але даволі хутка ўручылі ключы ад новай трохпакаёўкі. Вось зробім там рамонт і адзначым наваселле. Хіба гэта не цуд?

Клопатаў у сям'і, вядома, прыбавілася: двое немаўлят плюс сямігадовая дачка. Але жанчыне хапае часу і на хатнія справы, і на сябе. Па лініі сацслужбы ёй прызначылі няню, якая кожны дзень на працягу 4-5 гадзін цалкам бярэ на сябе абавязкі па доглядзе малых: корміць іх, гуляе на вуліцы і г. д. Усе выдаткі на няню ўзяла на сябе дзяржава. Сямейны капітал таксама павялічыўся — штомесячная дапамога на дваіх дзяцей складае 1400 рублёў, плюс нядрэнная надбаўка на непаўналетнюю дачку.

Намеснік начальніка Слаўгарадскага ўпраўлення па працы, занятасці і абслугоўванні насельніцтва Дзмітрый КРАСЕЎ таксама шматдзетны бацька — выхоўвае траіх дзяцей.

— Сям'я без дзяцей — не сям'я, — лічыць ён. — Ды і дзяржава добра клапоціцца пра шматдзетных. Вось у нас, напрыклад, службовая кватэра, а з трыма дзецьмі мы атрымалі магчымасць пабудаваць сваё жыллё за кошт крэдыту, які на 95 % кампенсуе дзяржава. Плюс павышаная дзіцячая дапамога. Паколькі раён лічыцца чарнобыльскім, маладая маці атрымлівае яе на 50 % больш, чым у іншых мясцовасцях. І сёння 700 рублёў на адно дзіця — важкая прыбаўка да сямейнага бюджэту. А калі дзяцей больш чым двое, даплачваецца яшчэ і надбаўка.

Дырэктар Слаўгарадскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Людміла ВАРАНЦОВА адзначае, што шматдзетнасць — гэта не толькі магчымасць атрымаць сямейны капітал, але яшчэ гонар і павага. У раёне 42 жанчыны ўзнагароджаны ордэнамі маці. Сёлета рыхтуюцца дакументы яшчэ на шэсць мам, якія выхавалі па пяць-шэсць дзяцей.

Людміла Варанцова прыводзіць наступныя лічбы. У раёне 252 шматдзетныя сям'і, якія выхоўваюць 839 непаўналетніх дзяцей. У жанчын вельмі высокая матывацыя нараджаць. Шматдзетным сем'ям выплачваецца дапамога, у тым ліку адрасная. Жанчыны могуць датэрмінова скарыстаць сямейны капітал, атрымаць гуманітарную дапамогу прадуктамі і адзеннем. З такімі сем'ямі трымаюць сувязі магілёўскія дабрачынныя арганізацыі «Табея» і «Благо». Пра бясплатныя паслугі няні ўжо гаварылася вышэй.

— Станоўчая дынаміка па нараджальнасці захоўваецца ў нас на працягу апошніх некалькіх гадоў, — сведчыць **Марына НІКІЦІНА, начальнік аддзела ЗАГС райвыканкама.** — Напрыклад, летась у Слаўгарадскім раёне нарадзілася 139 дзяцей, у 2018 і 2017 гадах — 148 і 138 адпаведна. А самы, як той казаў, ураджайны год быў 2015-ы — нарадзілася 186 дзяцей. Я працую тут з 2007-га, і такі рост адбыўся ўпершыню за гэты перыяд. Стала больш шматдзетных сямей. Жанчыны нараджаюць не аднаго-дваіх дзяцей, а чатыры-пяць. Сёння ў нас 166 сямей выхоўваюць трох дзяцей, 51 — чатырох, 19 — пяцярых, 6 — шасцярых, а дзве сям'і маюць па сем дзяцей. Гэта ў многім вынік таго, што людзі адчуваюць стабільнасць і клопат з боку дзяржавы. У раёне шматдзетныя сем'і вельмі хутка забяспечваюцца жыллём. Летась, дарэчы, мы распісалі 71 маладую пару. З пачатку года захоўваецца станоўчая дынаміка рэгістрацыі шлюбаў і народжаных дзетак.

...У Слаўгарадскім раёне ёсць унікальнае месца, якое нібыта спрыяе нараджэнню дзяцей. Гэта так званы Блакітны калодзеж. І, кажуць, мясцовыя жанчыны часта звяртаюцца да яго па дапамогу. Хто ведае, можа, гэта толькі прыгожая легенда, але шматлікія факты, якія я назвала вышэй, гавораць на яе карысць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Дэмаграфія: рэаліі часу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дзіцячая смяротнасць у 2019 годзе дасягнула гістарычнага мінімуму — 2,4 праміле. Гэта 2,4 выпадка на 1000 жыванароджаных дзяцей. У 2018 годзе яна складала 2,5 выпадка на 1000 жыванароджаных, у 2017-м паказчык дзіцячай смяротнасці быў 3,2 праміле. Трэба адзначыць, што ў Беларусі ён заўсёды захоўваецца на адным з самых нізкіх узроўняў у Еўропе.

Мацярынская смяротнасць у Беларусі ў 2019 годзе склала 1,1 выпадка на 100 тысяч нованароджаных дзяцей. Адзіны выпадак мацярынскай смяротнасці з акушэрскай прычыны летась адбыўся ў Мінскай вобласці.

— Нягледзячы на такія дастойныя вынікі, служба павінна знаходзіцца ў пастаяннай гатоўнасці для аказання экстраннай дапамогі, — адзначыў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК** падчас выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя. — Сучасная дэмаграфічная сітуацыя ў краіне застаецца напружанай, і яна вызначаецца шэрагам ключавых праблем: нізкім узроўнем нараджальнасці, старэннем насельніцтва. Нягледзячы на стабілізацыю паказчыкаў, застаецца даволі высокім узровень смяротнасці.

На жаль, каэфіцыент нараджальнасці ў краіне працягвае зніжацца. За 11 месяцаў 2019 года ён склаў 9,4 праміле, а годам раней быў 10,1. Каэфіцыент смяротнасці застаецца на ранейшым узроўні і складае 12,8 праміле.

Рэаліямі нашага часу сталі скарачэнне колькасці жанчын фертыльнага ўзросту, больш позні надыход цяжарнасці, памяншэнне колькасці дзяцей у беларускіх сем'ях, павелічэнне колькасці разводаў.

У такіх умовах у захаванні рэпрадуктыўнага здароўя насельніцтва ўзрастае роля медыцыны. Важна зрабіць усё магчымае, каб пары, якія жадаюць мець дзяцей, маглі гэта ажыццявіць, падкрэсліў міністр. (Дарэчы, узровень бясплоднасці ў Беларусі складае 14 %.)

— Задача медыцыны — не толькі зніжэнне захваральнасці, інваліднасці і смяротнасці, але і павышэнне нараджальнасці за кошт прафілактыкі абортаў, даступнасці і эфектыўнасці дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій.

Алена КРАВЕЦ.

Летась дзякуючы псіхалагічнай дапамозе і перадабортнаму кансультаванню ўдалося захаваць да 19 % цяжарнасцяў. У 2019-м колькасць абортаў знізілася з 9,0 да 8,2 на тысячу жанчын фертыльнага ўзросту.

ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

29 апреля 2020 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке, руб.	Примечание
Лот № 1	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Ясная, уч. 12	0,1500	625680202201000214	10 000,00	0 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению
Лот № 2	Дещенский сельисполком	д. Володьки, 1-й проезд Строителей, уч. 9	0,1500	625680202201000239	10 000,00	0 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению
Лот № 3	Дещенский сельисполком	д. Колодино, ул. Колодинская, уч. 23	0,1500	625680206401000041	5000,00	76,50 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к электроснабжению
Лот № 4	Дещенский сельисполком	д. Колодино, ул. Колодинская, уч. 31А	0,1000	625680206401000040	4500,00	76,50 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к электроснабжению
Лот № 5	Дещенский сельисполком	д. Рыбаковщина, ул. Рыбаковщинская, уч. 20А	0,1033	625680211701000042	5000,00	1657,08 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к газоснабжению. электроснабжению
Лот № 6	Дещенский сельисполком	д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. 43	0,1500	625680211801000079	7000,00	1179,28 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению
Лот № 7	Дещенский сельисполком	д. Теляково, ул. Октябрьская, уч. № 16Б	0,1000	625683403601000203	6000,00	0 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY2X, УНП 601068832. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **24 апреля 2020 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенный банком документ об оплате задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем самостоятельного выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **info@uzda.gov.by**, либо по телефонам: **(801718) 35135, 35149.**